
этнакрама
Цудоўня
Этнакрама "Цудоўня". Кірава, 3
13 траўня
17:30 лекцыя ад даследчыцы Алены Ляшкевіч
"Позневясновыя святы: Юр'я і Мікола"
Уваход 2 руб.

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р., 2015 г.



# Юр'я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р. 2015 г.



# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.

Да мы Юр'я пачынаем,
Да мы Бога звелічаем.
Падай, Божа, да замкоў ключы
Адамкнуці сырую зямліцу
Да выпусціць Божую расіцу
Да на жыта, на пшаніцу,
Да на ўсякую пашніцу,

Каб на корань караністае,
А на сцябло да сцяблістае,
А на колас каласістае -
З каласочка да жыта бочка;
Каб на таку умалотнае,
А у млыне да прымолнае,
А у дзяжы падыходнае,
А у печы да прыпёкнае,
А на стале сытна-

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.



Маладая малодачка,
Выйдзі-выйдзі на вулачку,
Вынясь-вынясь падарачак,
Падарачак — паясочак.
Коку-яек на паўміску,
Каўбасою акружыці,
Белым сырам

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р. 2015 г.



# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.



Ой, хадзіла пава па балоце,

да лі, Юрай, і рана, па балоце,

Да зьбірала пава трасяйко,

Да зьвівала пава гнязьдзяйко,

Да зьнясла пава тры яечкі,

Да сядзела пава тры нядзелькі.

Высядзела пава тры паненкі:

Першая паненка -

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.



За гарою хмарка ўстала,
За другою гром загрымеў,
За трэцяю дожджык
пайшоў,
Ў агародзе часнык ўзышоў.
Ішлі дзеўкі вулачкамі,
Пілі віно кубачкамі.
Ішлі хлопцы граніцамі,
Пілі віно дайніцамі.
Ішлі дзеўкі борам, борам,
Гаварылі з Богам, з Богам.
Ішлі хлопцы лесам, лесам,
Гаварылі з чортам лысым

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.



Ой, на вуліцы камень
Каля каменя ліпа,
Ой, на ліпе пташочкі,
Ой, высока сядзелі,
Ой, далёка глядзелі:
Ой, адкуль вецер вее,
Ой, адтуль мілы едзе.

# Юр’я ў в. Ахонава Дзятлаўскага р.

Праважаем Юр’я за сяло,
да лі, Юрай, рана, за сяло,
Каб была дзявочкам вясяло.
Ой, Юр’ёва ночка маленька,
Да шыла кашулю паненка,
Ой, да яна шыла, ой, шыла,
Да Юр’ёву ночку п(ы)расіла:
— Ты, Юр’ёва ночка, памажы,
А ты, ясны месяц(ы), пасвяці,
А ты, ясна зорка, пастрачы.

# Юр'я ў в. Збляны Лідскага р.

## АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



Запіс зроблены ў студзені 2006 г. у в. Збляны Лідскага р-на Гродзенскай вобл. ад Шушкевіч Веры Паўлаўны 1930 г. нараджэння Папковай Аляксандрай Сяргееўнай.

Абрад

На Юр'е пад вечар, на заходзе сонца ішлі па вёсцы і тры разы спявалі "А мы Юр'і сустракаем"; спяваючы падыходзілі да хат, дзе на працягу года (ад Юр'я да Юр'я) было вяселле, і спявалі:

"А над сялом з бляскам,
Узышлі тры зоранькі ясны:
Перша зоранька — Надзюшанька, (напр.)
Друга зоранька — Верушанька,
Трэцяя зоранька — Людмілачка."

У тады прыйдзеш да першай хаты, астановішся і пачынаеш спяваць вельма-

# Юр'я ў в. Збляны Лідскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



Ванне той маладзіцы:
"Маладая маладайка
Выйдзі да нас на вуліцу
Вынясі нам падарачак
Падарачак - паясочак, хлеба кусочак."
Нікалі давалі паясы, а цяпер ужо ўсё даюць.
Маладайка павінна была ў адказ:
"Маладая маладайка
Я выйшла да вас на вуліцу
Я вынесла вам падарачак
Падарачак – паясочак, хлеба кусочак"
Калі маладая не выходзіла, то спявалі:
"А дзе ты паясі падзявала?
Можа, байстручкоў спавівала?
А, можа, у крапіўцы паўкідала?"

# Юр'я ў в. Збляны Лідскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93


Старасту, ды непанатаму спявалі:
"Стары Зыдар непанаты,
Ты па поле барадаты,
Чэрві сала латаючы,
Мыша граны лапаеші,
Ды Здара не ламіші".

Потым каля Нёмна раскладвалі касцёр, скакалі праз яго, частаваліся падарункамі, ігры праводзілі, пелі да рассвета.

# Юр'я ў в. Збляны Лідскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 96

1940 года ...

| | |
|---|---|
| запісана ў в. Збляны Гродзенскай в-сці ад Лазарчук Глафіры Александраўны 1940 г. нараджэння, праваслаўная. Запісалі: Яўчанка Настасся і Бурдун Вольга. | Юраўская песня. |

Ой, над сялом, сялом Збляніскім
Выйшлі тры месяцы ясны
Першы месяц — Іванушка,
Другі — Васечка, трэці — Колечка.

Ой, над сялом, сялом Збляніскім
Выйшлі тры зорачкі ясны
Перша зорачка — Ірыначка,
Другая — Волечка, трэцяя — Насцечка.

# Юр'я ў в. Навіны Навагрудскага р.

АІМЭФ ф. 13 воп. 11 спр. 96



Запісана ў в. Навіны Навагрудскага р. ад Своран А.А., 1928 г. нарадж.

Запісала Усімовіч А. І.

Песня на Юр'я

Маладая маладачка
Выйдзі да нас на вуліцу
Вынясі нам падарачак
Вынесь хлеба кусочак
Вынясі нам паясочак
Дзе ж паяскі падзявала
Мо ж, байструкі спавівала.

Дзяўчына, што першы год замужам, выводзіла выводзіла ў гэты дзень карову ў статак. [illegible]чына выносіла ленту і кідала яе ў гурт. Астатнія палучаня рвалі ленту на кавалачкі і пакідалі сабе.

# Юр'я ў в. Воўпа Ваўкавыскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



| | |
|---|---|
| У вёсцы Воўпа вобл. Гарадзенскай р-не Ваўкавыскім ад Кароль Тац. Іван, 1930, БДУ, з сям'і праваслаўных, па мужу католічка, не мясцовая, з Слуцкага р-на, в. Падлессе, запісала Канаш Нат. у студзені 1993 | Жанр і час выканання. |
| 6 мая Юрый. На руне, на гэта свята хадзілі на росу. Потым кожная сям'я ідзе на свае палосу. Спачатку вып'юць, паядуць усё, што ёсць, потым трэба пакачацца, каб добра жыта радзіла. Потым праходзяць у хату і гуляюць. | Каляндарная абраднасць 6 мая |

# **Юр’я ў в. Погіры Дзятлаўскага р.**

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



| Запісана ад Рудзевіч Зінны Мікалаеўны 1929 г. н., жыхаркі в. Погіры Дзятлаўскага р-на, Гродзенскай вобл. Запісала Масейчак Ірына | Юр'еўскі абрад |
|---|---|

За дзень да Юр'я танчоны-маладзіцы збіраюцца ў адной хаце і віюць вяночак, спяваючы песню:

Мы заўем вяночкі
На годы добрыя
На жыта густое
На ячмень каласісты
На авёс расісты
На грэчку чорную
На капусту белую

Вечарам, калі зойдзе сонейка, танчоны ідуць да Крыжа і, перахрысціўшыся, прыбіраюць яго. На Крыж чапляюць стужкі, вяночак, саматканы ручнік і абавязкова іконку. Пры гэтым просяць у Бога, каб ён памог заклікаць Юр'я:

Ой памажы, Божа, Юр'я заклікаці
Юр'я заклікаці, вясну заспяваці
На цёплае лета, на буйное жыта
На полі снапамі, у свірне гарудамі

Потым танчоны бяруцца за рукі і ідуць 3 разы з пачатку у канец вёскі, пяючы песню „Да Юр'я да сам Бог кліча...“ За трэцім разам яны заходзяць на надворак маладзіцы і пытаюць дазволу паспяваць песню. И

# Юр'я ў в. Погіры Дзятла ўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



...ам маладзіца згодна, яна павінна ...ядчыніць першае ад покуця вакно. Тады жанчыны пачынаюць спяваць:

Маладая (2р) малодачка
Выйдзі з намі (2р) на вулачку
З дзяўчаткамі (2р) пастаяці
З хлопчыкамі (2р) пагуляці
Ой не выйду (2р) мае вы дзяўчаткі
Свёкар скажа (2р) пасялуха
Свякроў скажа (2р) палятуха
Міла скажа (2р) панурначка
Маладая (2р) малодачка
Ці ж не ўмееш (2р) адказаці
Пасялуха (2р) па сяле ходзіць
Палятуха (2р) па полі лятая
Панурначка (2р) цёмная ночка
Маладая (2р) малодачка
Па пакоі (2р) паходжая
Паясочкі (2р) раскладая
На дзяўчатак (2р) раскідая

За песню маладзіца павінна абдзяліць кожную жанчыну: яна дае ім стужкі, хусцінкі, саматканыя паясы ў якіх да гэтага часу ў маладзіцы павінна быць прыгатавана „міса" ці „карзіна" з сырам, маслам, яйкамі, булкай, каўбасой (усе пачастункі павінны быць дамашнімі, саматробнымі). Пасля, падзякаваўшы маладзіцу, жанчыны выбіраюць хату лепшага гаспадара і ідуць да яго на надворак. Адразу жадаюць яму, каб усё было добра ў гаспадарцы:

# Юр’я ў в. Погіры Дзятлаўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93


Ой дай, Божа,
На зямельку травіцу
На травіцу расіцу
На мясочак місточак
У вясёлы дзянёчак
Дай, Божа, на жытачка род
На статачак плод
А гаспадару ў хаце здароўечка.

Потым, атрымаўшы згоду на спяванне, пяюць песню гаспадару:
Ой ці дома пане-гаспадару?
Ды няма дома пана-гаспадара:
Пайшоў гаспадар каля ніўкі,
Каля ніўкі, каля пашанкі.
Ой ды прыйшоў ды гаспадар дадому
Ї стаў размаўляці з жонкаю:
Ой да дзякуй Богу за нашу ніўку,
Што яна ды урадзіла
Ды у трубы пакруціла
Ды на мету палатола.

За добрую песню гаспадар дае пачастунак. Далей адна з жанчын прапануе паспяваць песню маладому хлопцу-кавалеру. Заходзячы на надворак, спяваюць:
Ой да дзень добры, маладзы хлапчоне!
Ці вялім нам пад акенца стаці
Бочку мядочку спявальнічкам даці
Нам жанчонкам на ганачку пагуляці.
Потым спяваюць песню менавіта хлопцу.

**Юр’я ў в. Погіры Дзятлаўскага р.**

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



Ці не дома паніч ваш?
От няма дома паніча:
Паехаў паніч уначы
Ды застаў паненку не спючы
На высокум ганачку седзючы
Тонкую кашулю шыючы
Яна шыла-старала
Цёмнай ночкі прасіла:
„Цёмная ночка памянніся,
Ясны месяц пасвяціся,
Бо будзе ехаці мой міленькі уначы.”

Маладый хлопец частуе жанчын мёдам. Сабраўшы пачастункі, жанчыны ідуць у канец сяла, спяваючы песню „Праважаем Юр'я за сяло...” Потым збіраюцца ў адной хаце, частуюцца, жартуюць, спяваюць песні.

# Юр’я ў в. Патукі Іўеўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



Запісана ў вёсцы Патукі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ад Кміцевіч Марыі Станіславаўны, 1925 года нараджэння.

Запісана ў 2001 годзе Мусюневіч А. І.

~~Каляндарна абрадавая паэзія~~

Этнаграфічнае апісанне свята Юр'я.

На свята Юр'я запасвалі жывёлу. Пад парог хлява, з уміўя, клалі: вярбу, яйка, хлеб, соль. Усё гэта рабілася дзеля таго, каб жывёла добра хадзіла на пашу, мела шмат малака і не баялася урокаў.

# Юр'я ў в. Меляхі Іўеўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93



| | |
|---|---|
| Запісана ў вёсцы Меляхі Іўеўскага раёна ад Юркевіч Аркадзіі Емяльянаўны 1929 года нараджэння. Запісана ў 2001г Блізняк Марынай Станіславаўнай | жанр |
| Юр'я<br>Ў гэты дзень зямлі не рушылі, бо град наб'е, не гарадзілі плоту, бялізну не адбівалі. | каляндарная абраднасць (веснавы перыяд) |

# Юр'я ў в. Камянчаны Мастоўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93


Запісана ў в. Камянчаны Мастоўскага р-на, Гродз. вобл. ад Стракіі Кафлаўны Сівук 1935 г.н. 7 кл. Лабар Т., Ісавец А., Уода В. 27.07.97 г

Спачатку людзі ішлі ў царкву, а пад вечар усе збіраліся каля лесу, дзе мужчыны з зямлі майстравалі стол, на якім ставілі розныя пачастункі. Перад застоллем хлопцы і дзяўчаты бегалі наперагонкі да жыта, якое павінна расці непадалёку. Калі які-небудзь хлопец дагоніць дзяўчыну, з той і будзе хадзіць у

свята Юр'я

# Юр’я ў в. Камянчаны Мастоўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 93

пары. Затым усе ідуць за стол, за якім ідзе
гулянне, а пазней музыкі граюць, а людзі
танцуюць і пяюць песні:

Дзе Юрый ходзіць, там жыта родзіць,
Хрыстос уваскрос на ўвесь век,
Дзе Юрый нагою, там жыта копною,
Хрыстос уваскрэс на ўвесь век.
Дзе Юрый рогам, там жыта стогам
Хрыстос уваскрэс на ўвесь свет.

# Юр’я ў в. Пагост Жыткавіцкага р., 2015 г.





# Юр’я ў в. Пагост Жыткавіцкага р., 2015 г.



# Юр’я ў в. Пагост Жыткавіцкага р., 2015 г.



# Юр’я ў в. Пагост Жыткавіцкага р., 2015 г.



# Юр’я у в. Іванава Слабада Лельчыцкага р. (дэманстрацыя ў БДМНАіП)



# Масленіца ў в. Тонеж Лельчыцкага р., 2014 г.



# Стрэчанне ў в. Новае Палессе Лельчыцкага р., 2018 г.



# Стрэчанне ў в. Новае Палессе Лельчыцкага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр’я ў в. Обчын Любанскага р., 2018 г.



# Юр'я ў в. Хомічы Мастоўскага р.

АІМЭФ, ф. 13, воп. 11, спр. 96

...скі раён

Запісана ў в. Хоміча Мастоўскага р-на, Гродз. вобл. ад Зінаіды Лук'янаўны Козел 1939 г.н., 7 кл. Лабар Т., Лісавец А., Юра В.

30. 07. 97г.

песня спяваецца на св. Юр'я

Ой ты Юр'я Мікола,
Абыдзі жыта навкола.
Юр'я кажа — абыду,
Мікола кажа — паглядзу.
Юр'я кажа — караміста,
Мікола кажа — каласіста.
Юр'я кажа — у копачкі,
Мікола кажа — у снапочкі.
Юр'я кажа — з прыкроем,
Мікола кажа — з прыпёкам

# Мікольская свяча ў в. Новая Слабодка Клічаўскага р.





# Варварынская свяча ў в. Басценавічы Мсціслаўскага р., 2015



# Траецкая свяча ў в. Навінкі Калінкавіцкага р., 2016 г.



# Міхайлаўская свяча ў в. Вяляцічы Барысаўскага р., 2012 г.





Абрад пераносу свячы адбываецца ў в. **Навaселле Бярэзінскага раёна** 2 разы на год: на Ушэсце (саракавы дзень пасля Вялікадня) і  на свята абраза Маці Божай Казанскай (4 лістапада). Фота 2013 г.

# Мікола зімовы ў в. Новая Слабодка Клічаўскага р., 2015 г.



# Мікола зімовы ў в. Новая Слабодка Клічаўскага р., 2015 г.

Усердзіўся сьвяты Мікола
На старасту й на старога:
— Ня ўмееў мяне шанаваці,
Ярай пшонкай абсыпац
У жыцечку год дзержаці



# Мікола зімовы ў в. Новая Слабодка Клічаўскага р., 2015 г.



# Мікола зімовы у в. Новая Слабодка Клічаўскага р.

Ішлі Юрый з Міколаю
Слабодскаю й уліцаю.
— Станьма, Юрый, паслухайма,
Што ў Слабодцы за шум, за крык,
Што ў Слабодцы за гадзіна.
Пашла маці проч ад сына,
Шла йна поля, шла й другоя,
На трэцяя ўзыходжала
Абніла яе цёмна ночка.
Села йіна пад кусточкам

Стучыць-гручыць па дарозе
Сын за маткай наўздагоны:
— Вярнісь, вярнісь, мая мамка, / старэнькая,
— Не вярнуся, мой сыночык, / сакалочык:
Дзяцей тваіх памарыла,
Жану тваю зажурыла.
— Буду дзяцей навучаці,
Жану буду сукрачаці,
Вярнісь-вярнісь, мая

# Юр'я у в. Хомічы Мастоўскага р.



Запісана ў в. Хомічы Мастоўскага р-на.
Гродз. вобл. ад Зінаіды Лук'янаўны Козел
1939 г.н., 7 кл. Лабар Т., Лісавец А., Юода В.
30.07.97г.

Юр'ева маці ўпроч пайшла
Залатыя ключы пацяела
Юр'ева маці вярнісе.
Залатыя ключы найшлісе.
Адамкні зямліцу,
Выпусці расіцу
на зялёну травіцу
на здраўву вадзіцу

песня

спявацца на св Юр'я.

# Мікола ў в. Прудок Мазырскага р., 2015 г.



# Мікола ў в. Прудок Мазырскага р., 2015 г.



# Мікола ў в. Прудок Мазырскага р., 2015 г.



# Дзякуй за ўвагу!

Алена Ляшкевіч
sionniaviecier@gmail.com
vk.com/alena_rosica